**ДВА ГАДЫ ПАД ПРЫЦЭЛАМ ДУШМАНАЎ**



*Упэўнена: калі спытаць любога воіна-іннтэрнацыяналіста пра асноўныя падзеі ў жыцці, усе яны ў ліку іншых назавуць службу ў Афганістане. Незалежна ад таго, колькі часу знаходзішься там – тыдзень або год ці нават больш. Бо той перыяд немагчыма забыць, сцерці, нібы ласцікам, са свядомасці. Ён назаўсёды ўрэзаўся ў сэрца, пакінуўшы ў ім след.*

Для пастаўчаніна Часлава Іванавіча Гайбовіча гэты «след» аказаўся даўжынёй у два гады і два месяцы. У Афганістан прапаршчык Гайбовіч трапіў восенню 1984-га. У іх часць знішчальнікаў-бамбардзіроўшчыкаў, дзе служыў у батальёне тэхнічнага забеспячэння, прыйшла разнарадка: для адпраўкі ў дружалюбную Савецкаму Саюзу краіну патрабуюцца старшына роты і камандзір аўтамабільнага ўзвода. Прэтэндэнтам на апошнюю пасаду і стаў Часлаў Іванавіч, які на той час ужо быў жанаты і меў дваіх дзяцей.

– З перасыльнага пункта ў Кабуле, куды прыляцелі, нас адправілі ў Джалалабад, – успамінае ён падзеі 30-гадовай даўнасці. – Часць размяшчалася на ўскраіне горада, на аэрадроме. Пасяліліся ў зямлянках, потым пабудавалі так званыя модулі – баракі з фанеры, у якіх і жылі да вяртання на Радзіму.

Узвод Ч. І. Гайбовіча (каля 50 чалавек: 8 вольнанаёмных цывільных, астатнія – салдаты) забяспечваў полк практычна усім, што не маглі даставіць у яго самалёты: ад лыжак і прадуктаў харчавання да ложкаў. Вазілі іх з Каратона, Кабула, Баграма. Прыкладна за 12 кіламетраў ад палка знаходзілася дэсантна-штурмавая брыгада. У вызначаны дзень адтуль адпраўлялася калона з сотні машын, да якой далучаліся некалькі машын узвода матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і разам у суправаджэнні батальёна аховы даязджалі да раней агаворанай кропкі на маршруце. Там чакалі такую ж калону з Кабула ці іншага горада, куды трэба было дабрацца. Ахова разварочвалася. Кабульская

забірала з сабой джалалабадскіх і суправаджала іх астатнюю частку маршруту, а джалалабадская даводзіла да месца назначэння кабульскіх.

– Падчас паходаў мы не раз траплялі пад абстрэл снайпераў, якія сядзелі ў засадзе ў тарах, – апавядаў ветэран. – Тады прыходзілася паліць і скідваць з дарогі падбітыя ворагам КамАЗы, самім быць жывой мішэнню для душманаў. На шчасце, мяне кулі абміналі. Салдаты нават далі мянушку Замоўлены. Хоць страты ва ўзводзе, безумоўна, былі.

За службу ў «гарачай кропцы» С. І. Гайбовіч узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі», мае таксама шмат юбілейных медалёў. З камандзіроукі ў Афганістан ён вярнуўся ў званіі старшага прапаршчыка, якое атрымаў праз 4 месяцы знаходжання там. Апошнія паўгода камандаваў ужо не ўзводам, а ротай. У Паставах прадоўжыў служыць у роднай часці, пакуль у 1993 годзе яе не перавялі ў Ейск.

Даведаўшыся пра змяненне месца дыслакацыі вайсковага фарміравання, жонка Часлава Іосіфавіча паставіла яму ультыматум: або армія, або сям’я. Маўляў, дзеці выраслі практычна без бацькі. І той прыняў рашэнне ў 36 гадоў пайсці на пенсію. Але сядзець дома не стаў, уладкаваўся дзяжурным у КЭЧ, потым перайшоў на хлебазавод, адтуль – у ААТ «Маладзечналес». Канчаткова выйшаў на заслужаны адпачынак два гады назад, цяпер дапамагае гадаваць унукаў. Іх у ветэрана трое. Старэйшы, якому хутка споўніцца 14, жыва цікавіцца баявым мінулым дзеда. І той расказвае пра Афганістан, зразумела, апускаючы падрабязнасці, якія могуць параніць дзіцячую псіхіку.

Не даюць забыць пра Афган і шматлікія знаёмыя і саслужыўцы, якія таксама там пабывалі і жывуць у Паставах. Штогод збі’раючыся разам 15 лютага, яны зноў і зноў прыгадваюць свае вогненныя камандзіроўкі.

**А. Шапавалава**

*// Пастаўскі край. — 2014. — 15 лют. — С. 5.*